Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

12. **Чыгрын, С.** Выдавецтва Барыса Клецкіна / С. Чыгрын // ЛіМ. – 2006. – 20 кастр. – С. 7.

13. **Шакун, Л. М.** «Беларуская граматыка для школ» Б. А. Тарашкевіча / Л. М. Шакун // Беларуская мова : энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – С. 81–82.

*Разглядаюцца падручнікі 1919–1930 гг., выдадзеныя ў Вільні, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і могуць выкарыстоўвацца ў экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання і іншых музеяў запаведніка.*

***Ліс М.М.*** *(Мінск)*

## БЕЛАРУСКІЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ 1920–1940-х гг.: НЕВЫДАДЗЕНЫЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

Энцыклапедычныя выданні з'яўляюцца важным і неад'емным атрыбутам нашага жыцця. Ад першага свайго з'яўлення да сённяшняга часу яны прайшлі доўгі шлях, змяняючыся і набываючы новыя рысы, але не страціўшы свайго галоўнага прызначэння – заставацца своеасаблівымі правадырамі-асветнікамі, захоўваць, папаўняць і даводзіць да карыстальнікаў дакладную, карысную інфармацыю па ўсіх ці асобных галінах ведаў, практычнай дзейнасці, персаналіях і г. д.

Сярод разнастайных відаў энцыклапедычных выданняў асобнае месца займаюць універсальныя энцыклапедыі. І гэта невыпадкова, бо менавіта ў іх у сістэматызаванай форме адлюстравана інфармацыя па ўсіх галінах ведаў, знамянальных падзеях і з'явах сусветнай рэчаіснасці, у тым ліку гісторыі, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця, пададзены звесткі пра найбольш вядомых і аўтарытэтных асоб, іншымі словамі, там сканцэнтравана ўсё самае каштоўнае і істотнае, што тычыцца сусветных здабыткаў.

У шэрагу ўніверсальных энцыклапедый знаходзяцца і нацыянальныя універсальныя энцыклапедыі, дзе перадусім акцэнт зроблены на асвятленні падзей і фактаў, звязаных з нацыянальнай тэматыкай.

Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі і ўсталявання новай беларускай дзяржаўнасці ў кіраўнікоў рэспублікі з'явілася думка аб стварэнні і ў Беларусі такога кшталту выдання.

Першая такая спроба адбылася ў 1927 г. Пад патранажам СНК БССР быў выдадзены своеасаблівы прадвеснік будучай беларускай энцыклапедыі – аднатомны даведнік на рускай мове пад назвай «Белорусская Советская Социалистическая Республика» [2]. Кніга павялічанага фармату (30×23 см) налічвала 528 старонак, 7 старонак прадмовы і адзін аркуш з памылкамі друку. Матэрыял быў размеркаваны па тэматычных раздзелах, якія адлюстроўвалі прыроду і насельніцтва БССР, гісторыю, дзяржаўнае будаўніцтва, заканадаўства, народную гаспадарку, асвету, ахову здароўя і інш. У якасці ілюстрацыйных матэрыялаў былі выкарыстаны карты, табліцы, дыяграмы. Ва ўступным артыкуле за подпісам І.А. Адамо-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

віча, які на той час займаў пасаду старшыні Савета народных камісараў Беларускай ССР, у прыватнасці, адзначалася, што «пытанне пра выданне больш поўнай кнігі – Беларускай Энцыклапедыі – выпускам дадзенай кнігі з парадку дня не здымаецца. Да 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі такая энцыклапедыя, з уключэннем у яе матэрыялаў пра становішча, дзейнасць і жыццё беларускага народа і па іншы бок савецкай мяжы, павінна быць выдадзена з улікам максімальнай дакладнасці ў статыстычных дадзеных і гісторыка-эканамічнага аналізу» [2, с. VI]. З гэтага вынікае, што ў кіраўніцтва рэспублікі ў канцы 1920-х гг. склалася пэўная думка аб падрыхтоўцы і выданні нацыянальнага ўніверсальнага энцыклапедычнага даведніка. Тым больш, што для рэалізацыі гэтага меліся спрыяльныя ўмовы і, перш за ўсё, шырокамаштабны працэс беларусізацыі, што закрануў самыя розныя сферы жыцця і пазітыўна адбіўся на развіцці нацыянальнай самасвядомасці беларускага насельніцтва. На базе створанай паводле пастановы ЦВК БССР Навукова-тэрміналагічнай камісіі пры Наркамаце асветы была распрацавана і выдадзена вялікая колькасць галіновых тэрміналагічных слоўнікаў на беларускай мове, што таксама стварала пэўны падмурак для будучай энцыклапедыі.

На Аб'яднаным пленуме ЦК і ЦК КП(б)Б, які праходзіў у Мінску 26–28 сакавіка 1932 г., дзе сярод іншых разглядалася і пытанне культурнага будаўніцтва, была прынята пастанова ў галіне тэарэтычнай працы, згодна з якой адзначалася наступнае: «Улічваючы ўзросшыя культурныя кадры БССР, востры яшчэ недахоп у навуковай беларускай кнізе, пленум ЦК і ЦКК лічыць неабходным разгарнуць работу па выданні энцыклапедыі БССР шляхам прыцягнення да гэтай працы лепшых навукова-тэарэтычных кадраў БССР, усяго Савецкага Саюза» [3, с. 427–428]. Але прайшло 2 гады, перш чым 21 красавіка 1934 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло рашэнне аб падрыхтоўцы выдання 10-томнай «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Часу на ажыццяўленне дадзенага праекта адводзілася надзвычай мала – усяго чатыры гады. Да таго ж выхад першага тома планавалася ажыццявіць не пазней за кастрычнік таго ж 1934 г. [4].

Праца па падрыхтоўцы энцыклапедыі павінна была праходзіць пад кіраўніцтвам Прэзідыума Акадэміі навук у спецыяльна для гэтага арганізаванай рэдакцыі «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Быў створаны рэдакцыйны савет, у які ўвайшлі вядомыя партыйныя, навуковыя і культурныя дзеячы. З боку дзяржавы былі вылучаны адпаведныя грашовыя сродкі, акрамя таго, Наркамлес павінен быў забяспечыць выданне дабраякаснай паперай [4].

На жаль, Беларускай энцыклапедыі не пашанцавала. Палітыка беларусізацыі, якая шырока праводзілася ў сярэдзіне 1920-х гг. і прынесла важкі плён, у гэты час была ўжо згорнута, а яе найбольш актыўныя прыхільнікі, сярод якіх былі ў тым ліку навукоўцы, палітычныя і культурныя дзеячы, спазналі палітычныя рэпрэсіі. Гэта не магло не паўплываць і на далейшы лёс выдання.

На працягу 1935 г. было ажыццёўлена 16 выпускаў тэматычных слоўнікаў «Беларускай савецкай энцыклапедыі» па розных галінах ведаў. Яны былі разасланы ў навуковыя ўстановы былога СССР, а таксама персанальна вядомым вучоным і спецыялістам. У фондзе Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваецца некалькі водгукаў на асобныя выпускі.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Так, «Слоўнік», які адлюстроўваў савецкае будаўніцтва і права, Вярхоўным судом СССР быў прызнаны незадавльняючым. У прыватнасці, у заключэнні ад 5 ліпеня 193[5] года за № 3085/7, падпісаным загадчыкам секратарыята Вярхсуда Саюза ССР[Г.Р.] Смаліцкім, адзначалася, што «ў слоўніку, задачай якога, як вынікае з прадмовы, з'яўляецца "ўзбраенне неабходнымі Марксісцка-Ленінскімі-Сталінскімі ведамі рабочых, калгаснікаў і працоўнай інтэлігенцыі Савецкай Беларусі ў іх барацьбе за пабудову сацыялізма", неабходна значна скараціць вызначэнні, якія ўзяты з рускага дарэвалюцыйнага і заходне-буржуазнага права, і ўзмацніць тэрміналагічна рэвалюцыйна-марксісцкай тэорыяй права і дзяржавы. Па адзначаных меркаваннях "Слоўнік" нельга лічыць задавальняючым» [6, л. 20].

«Слоўніку» па этнаграфіі і міфалогіі пашанцавала больш. У тым жа згаданым архіўным фондзе на яго захоўваюцца 4 станоўчыя водгукі: Інстытута народаў Севера ЦВК СССР [6, л. 2–4], вядомых этнографаў Я.Г. Кагарава [6, л. 21–22], Д.К. Зяленіна [6, л. 1], гісторыка В.Я. Данілевіча [6, л. 8]. У цэлым выпуск «Слоўніка» быў ухвалены з улікам асобных дапаўненняў і пажаданняў.

Да напісання энцыклапедычных артыкулаў была заангажавана вялікая колькасць аўтарытэтных аўтараў з ліку вядомых спецыялістаў. У канцы снежня 1935 г. быў падрыхтаваны і здадзены ў друк і першы том БелСЭ, які налічваў 3002 артыкулы. Паралельна рыхтаваўся і другі том, у якім планавалася размесціць 2820 артыкулаў [6]. Трэба адзначыць, што гэтая праца ажыццяўлялася ў надзвычай складаных умовах. Шмат хто з аўтараў на момант здачы тома ў набор ужо атрымаў найменне «вораг народа» і быў арыштаваны. Натуральна, што тая ж самая доля чакала і падрыхтаваныя імі артыкулы. Акрамя таго, частка персаналій, што ў свой час была ўключана ў энцыклапедыю, таксама падпадала пад разрад непажаданых і нават небяспечных для грамадства. У выніку некаторыя энцыклапедычныя матэрыялы перапісваліся нанова, іншыя ж наогул выкідваліся з падрыхтаванага макета [4].

У маі 1936 г. у складзе рэдакцыі «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі» адбыліся кадравыя змены. Замест кіраўнікоў, якія «выбылі», былі прызначаны новыя. Аднак гэта не прынесла станоўчых вынікаў. Першы том так і не быў надрукаваны. Матывацыяй для гэтага паслужыла тое, што ён нібыта не адлюстроўваў сапраўдага становішча, не папулярызаваў адданых сацыялізму людзей [4]. Пастановай Бюро ЦК КП(б)Б ад 10.11.1937 г. праца па падрыхтоўцы і выданні «Беларускай савецкай энцыклапедыі» была спынена, рэдакцыйна-выдавецкі апарат распушчаны, а ўсе матэрыялы, што тычыліся гэтага выдання, падлягалі знішчэнню не пазней за вызначаны тэрмін – да 1 снежня 1937 г. [4], што і было неадкладна выканана.

Акрамя ўніверсальнай энцыклапедыі ў Беларусі планавалася таксама падрыхтоўка і выданне літаратурнай энцыклапедыі. Пра гэта, прынамсі, узгадваецца ў артыкуле І.І. Шаўчука «З гісторыі стварэння Беларускай савецкай энцыклапедыі» [8], дзе даследчык, спасылаючыся на пэўныя дакументы, адзначае, што праца па выданні такога даведніка была распачата Беларускай акадэміяй навук яшчэ ў 1920-я гг. і «ўжо да вясны 1929 г. працавала рэдкалегія Літаратурнай энцыклапедыі» [8, с. 76]. «Увогуле, – працягвае аўтар, – яе правобразам можна лічыць камісію для складання біяграфічнага слоўніка пісьменнікаў, якая дзейні-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

чала ў складзе Інбелкульта. Але сутыкнуўшыся з такой аб'ёмнай і цяжкай для навуковага выканання справай, члены Прэзідыума БАН зразумелі, што сваімі сіламі Акадэмія з напісаннем энцыклапедыі не справіцца» [8, с. 176]. З гэтай мэтай яны звярнуліся ў Наркамат асветы з просьбай аб стварэнні пашыранай рэспубліканскай камісіі, у склад якой планавалася ўвесці прадстаўнікоў ад кафедры «Літаратурнай камісіі» Беларускай акадэміі навук, літаратурнай секцыі Навуковага таварыства БДУ, Таварыства марксістаў, літаратурных аб'яднанняў «Полымя», «Узвышша», БелАПП [8, с. 177]. Перад камісіяй ставіліся пэўныя задачы: складанне спісаў пісьменнікаў для ўключэння ў энцыклапедыю, рэдагаванне напісаных артыкулаў, а таксама вырашэнне розных арганізацыйных пытанняў [8, с. 177].

Сучасныя энцыклапедычныя выданні, у прыватнасці, «Беларуская энцыклапедыя» [1, с. 135], «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» [10, с. 632], «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» [9, с. 265] таксама падаюць сціплую інфармацыю аб падрыхтоўцы ў 1932–1933 гг. Інстытутам літаратуры і мастацтва АН БССР малой энцыклапедыі беларускай літаратуры (хутчэй за ўсё, узгадваецца тая ж самая літаратурная энцыклапедыя). Сярод тых, хто быў прызначаны для яе распрацоўкі, называюцца імёны Я.І. Барычэўскага, І.І. Замоціна, В.Ф. Мачульскага, М.М. Піятуховіча – аўтарытэтных, кампетэнтных навукоўцаў, якія ў свой час атрымалі добрую адукацыю, мелі вучоныя званні, працавалі у Інбелкульце, пасля ператварэння яго ў Беларускую акадэмію навук – у складзе навуковых устаноў АН, выкладалі ў вузах. На жаль, амаль усе яны, як і мільёны іх суайчыннікаў, у далейшым спазналі рэпрэсіі 1930-х гг., а ідэя стварэння малой энцыклапедыі беларускай літаратуры, таксама як і ўніверсальнай Беларускай энцыклапедыі, засталася не рэалізаванай.

У першыя пасляваенныя гады ў Беларусі на базе Інстытута гісторыі АН БССР была праведзена пэўная праца па падрыхтоўцы энцыклапедычнага даведніка, прысвечанага выбітным прадстаўнікам Беларусі, але, на жаль, і ён застаўся толькі ў чарнавіках. З 1986 г. гэты рукапіс пад назвай «Выдающиеся люди белорусской земли» ў колькасці дзевяці папак захоўваецца ў фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі [5]. Згодна з дакументамі Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі, праца над біябібліяграфічным слоўнікам была распачата супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі яшчэ ў канцы 1944 – пачатку 1945 г. і працягвалася да 1949 г. Паводле тлумачальнай запіскі да плана 1946 г., гэта праца была пазначана як адна з найважнейшых [7, л. 1]. Аднак у сілу невядомых нам абставін была прыпынена, а падрыхтаваныя матэрыялы трапілі ў архіў інстытута. Магчыма, пазней, у 1967 г., калі праца па выданні Беларускай універсальнай энцыклапедыі ўзнавілася і была створана Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі пры АН БССР на правах НДІ, матэрыялы да слоўніка маглі трапіць менавіта туды з мэтай іх далейшага выкарыстання ў новым энцыклапедычным выданні. На карысць гэтага меркавання гаворыць той факт, што ў акце перадачы «Слоўніка» ў Цэнтральную навуковую бібліятэку НАН Беларусі ў якасці ўладальніка дакумента фігуруюць дзве ўстановы – Інстытут гісторыі НАН Беларусі і БелСЭ.

Падводзячы вынік агляду энцыклапедычных даведнікаў, якія па тых ці іншых прычынах так і не атрымалі права на жыццё, можна зазначыць, што



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

энцыклапедычная справа ў Беларусі прайшла вельмі няпросты шлях. Аднак усё тое пазітыўнае, што адбывалася на гэтай ніве, асабліва ў 1920-я гг., і нават не вельмі спрыяльнае, адмоўнае, трагічнае, пазначанае 1930-мі гг., у канчатковым выніку з'явілася важным падмуркам для развіцця сучаснай беларускай энцыклапедыстыкі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларуская** энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1996–2004. – Т. 18, кн. 1.

2. **Белорусская** Советская Социалистическая Республика / [предисловие И. А. Адамовича]. – Минск : Издание СНК БССР, 1927. – VII, 528 с.

3. **Коммунистическая** партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК / Институт истории партии при ЦК КПБ – филиал Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. Т. 2 : 1928–1932. – Минск : Беларусь, 1984. – 510, [1] с.

4. **«Расстрелянная»** энциклопедия / Людмила Селицкая, Вячеслав Селеменев [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mypoliticum.ru/viewtopic.php?f=66&t=4721&p=120366#p120366. – Дата доступа: 29.01.2019.

5. **Цэнтральная** навуковая бібліятэка НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 23. – Воп. 2. – Адз. зах. 2–10.

6. **Цэнтральны** навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 70.

7. **ЦНА** НАН Беларусі. – Ф. 3. – Воп. 1. – Арх. 97.

8. **Шаўчук, І. І.** З гісторыі стварэння Беларускай савецкай энцыклапедыі / І. І. Шаўчук // Вучоныя запіскі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна : зб. навук. прац. – Вып. 7, ч. 1. – Брэст, 2011.

9. **Энцыклапедыя** гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993–2003. – Т. 6, кн. 2.

10. **Энцыклапедыя** літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя П. Броўкі, 1984–1987. – Т. 5.

*This article is studying encyclopedia business in Belarus in the period of 1920–1940s, including concrete encyclopedic handbooks that were not published.*

***Слука Н.М.** (Мінск)*

## БЕЛАРУСКІЯ ПРАВАСЛАЎНЫЯ ЧАСОПІСЫ ПОЛЬШЧЫ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (ПА ФОНДАХ АДДЗЕЛА РЭДКІХ КНІГ І РУКАПІСАЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ)

Па Рыжскай мірнай дамове 1921 г. у склад Польшчы была ўключана заходняя частка беларускіх этнічных зямель. Колькасць беларускага насельніцтва ў Польшчы складала больш за 2 млн чалавек; найбольш распаўсюджаным веравызнаннем сярод беларусаў было праваслаўе [3, с. 13]. Так, у Палескім ваяводстве праваслаўныя складалі 77,6% насельніцтва, таксама значным па колькасці было праваслаўнае насельніцтва Навагрудскага, Віленскага і Беластоцкага ва-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by